*Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!*

# Беларускі ўніверсітэт

Орган парткома, рэктарата, мясцкома, камітэта ЛКСМБ і прафкома Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта імя У. І. Леніна

№№ 17—18 (487—488) | Субота, 5 мая 1962 г. | Цана 1 кап.

**„Газета—не толькі калектыўны прапагандыст і калектыўны агітатар, але таксама і калектыўны арганізатар“.**

**У. І. ЛЕНІН.**

*Д. БЕДНЫЙ*

## ГАЗЕТА

Конфискованы №№ 1 и 2 рабочей газеты «Правда».

— «Слыхал?» — «Слыхал!»
— «Видал?» — «А не видал!»
— «Подумай: наша, брат, рабочая газетка...
Чай, жиру не придаст хозяйским-то горбам!»
— «Да... Кой-кому не по зубам
Конфетка».
— «А нам, гляди, как выйдет впрок!
Пойдем-ка-сь купим номерок».
Пошли, по переулкам рыщут,
Газету ищут.
— «Тьфу! Будто чорт газетчиков посмёл!»
— «Нашёл газетчика, нашёл!»
И впрямь нашёл, судя по бляхе медной,
Стоит парнишка сам не свой,
Весь бледный.
— «Газетку»... — «Братцы, всё унёс городовой!»
— «Ой, прах его возьми!.. Теперь хоть волком вой...
Ты шутишь, аль взаправду?!»
Нет, не шутил бедняк:
Под глазом у него синяк
За «Правду».

1912 г. «Правда» № 3.



# 50 год ЛЕНІНСКАЙ „ПРАВДЫ“

Сёння савецкі народ адзначае знамянальную дату—50-годдзе газеты «Правда». У Пастанове ЦК КПСС аб 50-годдзі газеты «Правда» падкрэсліваецца, што гісторыя газеты «непарыўна звязана з гераічнай гісторыяй Камуністычнай партыі Савецкага Саюза, са слаўнымі традыцыямі нашага партыйнага друку, закладзенымі У. І. Леніным».

50-годдзе «Правды» — важнейшая падзея ў ідэйным жыцці партыі і савецкага народа, у развіцці савецкага друку.

Ленінская «Правда» нарадзілася ў хвалях рэвалюцыйнага руху 1901—1914 гг. Пасля паражэння рэвалюцыі 1905—1907 гг. у Расіі наступіў перыяд рэакцыі. Здавалася, чорныя дні заслалі на доўгія гады Расію. Але гэта толькі здавалася. Хутка пачынаецца паласа новага ўздыму. Асабліва моцная рэвалюцыйная хваля ўзнялася ў краіне вясной 1912 года пасля расстрэла рабочых на ленскіх залатых капальнях.

Рэвалюцыйны ўздым выклікаў да актыўнага палітычнага жыцця сотні тысяч рабочых. У гэтых умовах патрэбна была штодзённая масавая рабочая газета. Без яе нельга было кіраваць рэвалюцыйнай барацьбой мас.

Надзённую неабходнасць у такім органе, як ніхто іншы, разумеў У. І. Ленін, і ён рыхтаваў яго выданне, з'яўляючыся арганізатарам і кіраўніком «Правды». Зімой 1911 года У. І. Ленін сустрэўся ў Лейпцыгу з Мікалаем Гур'евічам Палятаевым, рабочым дэпутатам сацыял-дэмакратычнай фракцыі III Дзяржаўнай Думы. Яны падрабязна абмеркавалі пытанне аб выданні штодзённай легальнай масавай рабочай газеты ў Пецярбургу. У час работы Пражскай канферэнцыі У. І. Ленін правёў спецыяльную нараду, на якой было вырашана прыступіць да выдання ў Пецярбургу газеты. У адпаведнасці з указаннем Леніна, Палятаеў узмацніў работу па падрыхтоўцы выдання «Правды» пры дапамозе «Звезды», якая адыграла выключную ролю ў падрыхтоўцы і стварэнні «Правды».

Працоўныя дружна адгукнуліся на заклік «Звезды» стварыць фонд штодзённай рабочай газеты. У рэдакцыю пачало паступаць многа пісьмаў ад рабочых, у якіх яны віталі ідэю стварэння газеты і ўказвалі, што яна павінна быць паслядоўна дэмакратычнай — гэта значыць, бальшавіцкай. Рабочыя ўсіх прафесій аб'ядналіся адной думкай — стварыць рабочую газету. Актыўны ўдзел у стварэнні «Правды» прынялі і рабочыя Беларусі. З Мінска і Гомеля, Бабруйска і Віцебска, Смаргоні і Гродна, ішлі зборы ў фонд «Правды». Асабліва ўзрасло паступленне грошай на «Правду» у час ленскіх падзей. Да дня выхаду «Правды» было сабрана на яе 4288 рублёў 84 капейкі. У. І. Ленін вельмі высока цаніў намаганні рабочых, накіраваныя на стварэнне «Правды». «Паставіўшы штодзённую рабочую газету,— пісаў ён, — пецярбургскія рабочыя зрабілі велізарную, без перавялічвання можна сказаць, гістарычную справу».

22 красавіка (5 мая) 1912 года ў 3 гадзіны ночы на Іванаўскай (цяпер Сацыялістычнай) вуліцы, у доме № 14 быў звярстаны першы нумар легальнай бальшавіцкай газеты «Правда», а ў 6 гадзін раніцы ратацыйная машына пачала выкідваць першыя нумары газеты.

Дзесяткі тысяч працоўных Пецярбурга, паслаўшых сваіх прадстаўнікоў у друкарню, з нецярплівасцю чакалі на заводах і фабрыках сваёй газеты. З такой жа нецярплівасцю чакалі яе працоўныя ўсёй Расіі. З'яўленне «Правды» было сапраўдным святам для рабочых. «Гэта быў,— пісаў М. І. Калінін,— незвычайны выхад, хоць бы і рабочай газеты».

Захапляючы прыём газеты рабочымі Расіі даказаў, што «Правда», нягледзячы ні на якія выхадкі трацкістаў і ліквідатараў, ні на якія праследванні і ганенні, будзе жыць.

Р. БУЛАЦКІ,
дацэнт,
загадчык кафедры тэорыі і практыкі партыйна-савецкага друку.



Толькі што атрыман свежы нумар «Правды». Студэнты БДУ спяшаюцца даведацца аб навінах у роднай краіне і за рубяжом. Сёння ж асаблівая навіна: інфармацыйнае паведамленне аб Пленуме ленінскага ЦК і выступленне М. С. Хрушчова аб выпрацоўцы праекта новай Канстытуцыі СССР.

*Указ Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР*

## Аб узнагароджанні газеты „Правда“ ордэнам Леніна

У сувязі з 50-годдзем газеты «Правда», заснаванай У. І. Леніным, і адзначаючы яе выдатныя заслугі ў рэвалюцыйным руху, у барацьбе за перамогу сацыялізма і камунізма, прапагандзе і ажыццяўленні вялікага марксісцка-ленінскага вучэння, у камуністычным выхаванні працоўных, узнагародзіць ГАЗЕТУ «ПРАВДА» ордэнам ЛЕНІНА.

Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР
Л. БРЭЖНЕЎ.

Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР
М. ГЕАРГАДЗЕ.

Масква, Крэмль,
4 мая 1962 г.

## Першамайскія віншаванні

*У першамайскія дні ў адрас Беларускага дзяржаўнага універсітэта паступілі шматлікія святочныя віншаванні. Калектыў універсітэта віталі са святам Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР В. Казлоў, міністэрства вышэйшай, сярэдняй спецыяльнай і прафесіянальнай адукацыі БССР, Усенародны камітэт балгара-савецкай дружбы, калектывы Варонежскага, Петразаводскага, Чарнавіцкага, Далёкаўсходняга, Таджыкскага, Кабардзіна-Балкарскага, Саратаўскага дзяржаўных універсітэтаў, Беларускага політэхнічнага інстытута, Мінскага педагагічнага інстытута, Беларускага інстытута механізацыі сельскай гаспадаркі, Куйбышаўскага індустрыяльнага інстытута, навуковай бібліятэкі Саратаўскага дзяржуніверсітэта, Мінскага спецыяльнага дзіцячага дома № 8 і іншых установ.*

# „ПРАЎДА"-ПАРТЫЗАНКА

Тыя, каму ў гады апошняй вайны прышлося жыць і змагацца ў глыбокім варожым тыле, заўсёды будуць памятаць «Праўду»— нашу родную газету-партызанку, як ласкава называлі яе партызаны і насельніцтва.

На памяць прыходзіць канец 1941 года, калі мне давялося ўпершыню чытаць «Праўду» на акупіраванай беларускай зямлі. Нас сустрэла сапраўды вялікае няшчасце. Савецкія войскі, глыбока перажываючы горач першых ваенных няўдач, вымушаны былі адступаць. Злавесная цень фашызма навісла над сталіцай. Акружаны з сушы задыхаўся Ленінград. Крывавая лапа моцнага і кавarnага звера, занесеная над краінай, пагражала смяротным ударам. Гэта былі самыя цяжкія дні ў жыцці нашай Айчыны. І, вядома, у сэрцы людзей магла закрасціся туга і трывога.

Але вось зусім нечакана, нібы прамень сонца сярод апраметнай ночы, адкульсьці з'явілася газета.

— «Праўда»!.. Звычайная, маскоўская! — з палёгкай уздыхнулі людзі, адразу зразумеўшы, што Масква наша, Масква стаіць. І прачыталі: 6 лістапада з небывалым патрыятычным уздымам адбылося традыцыйнае ўрачыстае пасяджэнне Массавета ў гонар Кастрычніцкай рэвалюцыі; 7 лістапада, як заўсёды, адбыўся ўнушальны ваенны парад на Чырвонай плошчы; на падступах да сталіцы, на лініях абарончых збудаванняў узводзяцца глыбокія супрацьтанкавыя рвы, эскарпы, робяцца драцяныя загароды, надалбы і іншыя супрацьтанкавыя перашкоды, у горадзе ўзводзяцца барыкады і акопы; на Урале рабочыя будуюць бронепаязды; на Кубані салдаткі куюць лемяша, каб араць, школьнікі па зярнятку сартавалі насенне, каб сеяць; усюды працоўныя збіраюць цёплае адзенне для чырвонаармейцаў,—і нібы сваіма вачыма ўбачылі нашу Айчыну, абпаленую, параненую, але мужную і моцную; зразумелі, што на ўсходзе рыхтуецца бязлітасны адпор варожаму націску, сакрушальны ўдар па ворагу, упэўніліся, што Масква выстаіць і будзе стаяць вечна, а захопнік будзе разгромлен, выгнан і знішчан.

Уплыў сапраўды ашаламляючы зрабіў гэты нумар «Праўды». Наўрад ці што іншае магло прынесці партызанам больш радасці і ўпэўненасці ў сваіх сілах.

Акупіраваная, але непакораная Беларусь ніколі не губляла сувязі з «Праўдой». Нават у самы змрочны час у беларускіх партызан бывалі прадстаўнікі «Праўды»—ваенныя карэспандэнты. З пуцёўкай рэдакцыі ў кішэні яны дабіраліся на самыя небяспечныя і адказныя ўчасткі партызанскага фронта. Асабіста ўдзельнічалі ў дзеяннях партызан і тут жа, у

**В. ДУБОВІК,**
*старшы выкладчык кафедры тэорыі і практыкі партыйна-савецкага друку, былы партызан Айчыннай вайны.*

□

лесе, у акопах, пісалі свае карэспандэнцыі, якія затым перадаваліся ў Маскву па радыё або перапраўляліся праз лінію фронта з дапамогай ваеннай авіяцыі. Праз гэтых карэспандэнтаў у «Праўду» і іншыя газеты пісалі сакратары падпольных абкомаў партыі, народныя мсціўцы. Блізасць да жыцця дазваляла ім лепш выражаць ідэі і сэнс адбываючыхся падзей. Старонкі «Праўды» заўсёды былы адкрыты для беларусаў.

Беларусь амаль рэгулярна атрымоўвала з Масквы «Правду», «Известия», «Комсомольскую правду», «Красную звезду» і іншыя газеты. Мяшкамі дастаўлялі іх на партызанскія аэрадромы самалёты або скідвалі на парашутах, а шмат прыносілі пешыя групы партыйных і ваенных работнікаў,— часам у падшыўках за два-тры месяцы. Па далёка няпоўных даных, толькі за 1941—1943 гг. ЦК КПБ адправіў у тыл, да беларускіх партызан, звыш 20 мільёнаў экземпляраў лістовак і звыш 5 мільёнаў экземпляраў газет, плакатаў, брашур. Гэта была па тых часах велізарная палітычная сіла. А на чале яе стаяла «Праўда». І амаль у кожным нумары можна было знайсці і прачытаць што-небудзь аб Беларусі або беларусах.

Менавіта з «Праўды» савецкія людзі дазнаваліся аб тым вялікім няўцешным горы, якое навалілася на Беларусь, аб тых беспрыкладных гераічных справах, якія рабіў беларускі народ. Такіх матэрыялаў, якія расказваюць аб жыцці і барацьбе беларусаў у варожым тыле, у камплекце «Праўды» ваенных год можна налічыць больш пяцідзесяці.

Перагортваючы старонкі газеты, мы бачым усю нашу шматпакутную Беларусь, бачым, як вораг дзіка шалеў і здзекаваўся над ёй, бачым страшэнны разгул фашызма.

11 снежня 1942 года газета ў артыкуле «Што адбываецца ў Мінску» пісала:

«Фашысцкая погань скрэмзала, спаганіла і знявечыла беларускую сталіцу, ператварыла яе ў турму для некалькіх дзесяткаў тысяч беларусаў, рускіх, яўрэяў. Шыбеніцы стаяць супраць Дома ўрада, супраць тэатра оперы і балета, ва Універсітэцкім гарадку і ў іншых месцах горада.

У Мінску расквартыравана шмат аддзяленняў гестапа, палявой жандармерыі, раённых камендатур, інспекцый, канцылярый, арганізацый па барацьбе з партызанамі. У Доме ўрада, на плошчы Свабоды, напрыклад, размясціўся з вялікім апаратам гестапавец, т. зв. генеральны камісар, намеснік Гітлера ў Беларусі Вільгельм Кубэ. Імя гэтага крывавага ката ніколі не забудзе беларускі народ! Падручны людаед Гітлера закатаваў сотні гераічных сыноў беларускага народа, тысячы безабаронных жанчын і дзяцей сталі ахвярамі яго злачынстваў».

Калі чытаеш такія матэрыялы, кроў стыне ў жылах.

Але не рабскую пакорлівасць, не ўсёдаравальны пацыфізм і не чалавеканенавісніцтва выклікалі яны. Калі людзі пазнавалі сваімі вачыма звярынае аблічча гітлерызма, яны ўздрыгвалі ад гневу, станавіліся зласней і бязлітасней, і ўсё гэта толькі ўзмацняла іх глыбокі пратэст, смагу помсціць ворагу. Уся змучаная Беларусь была ахоплена незгасным полымем нянавісці і святой рашучасці ісці на смяротны бой.

Са старонак «Праўды» перад намі паўстае вобраз гераічнага беларускага народа, вобраз гераічнай Беларусі — класічнай краіны партызанскага руху.

Экземпляры «Праўды», якія траплялі ў рукі партызанам, станавіліся свайго рода рэліквіяй, яны праходзілі сапраўды легендарныя шляхі. У 1941 годзе сяляне, каб атрымаць нумар газеты для сваёй вёскі, прыходзілі ў партызанскі штаб за дзесяткі кіламетраў. Савецкі народ з глыбокай пашанай, як вялікую каштоўнасць, захоўвае для нашчадкаў нумар «Праўды» ад 7 лістапада 1941 года, які прайшоў па руках многія сотні кіламетраў, тысячы населеных пунктаў некалькіх раёнаў і, прачытаны 10000 чалавек, патрапаны, у хустачцы, як свяшчэнны падарунак, вярнуўся ў Маскву.

«Праўда» для партызан на ўсім іх беспрыкладным баявым шляху была самым надзейным настаўнікам, без якога яны не абыходзіліся ні ў самыя бязрадасныя дні працяглых блакад і цяжкіх пераходаў, ні ў дарагія хвіліны перадышкі. Яна была тым абавязковым пайком духоўнай ежы, тым недакранальным запасам боезабеспячэння, без якога жыць, асабліва ў варожым тыле, немагчыма. Як верны сябра, «Праўда» заўсёды была з імі.

Так, гэта была сапраўды партызанская, самая неабходная, самая любімая партызанская газета.

І сёння, адзначаючы юбілей «Праўды»,—баявога органа ЦК КПСС, газеты ўсяго савецкага народа,— кожны партызан абавязкова скажа:

— Дзякуй табе, мая дарагая партызанка!




Называцца так, як ленінская «Праўда» — вялікі гонар. Таму зразумела, што большасць газет партызанскага падполля насіла гэтае пачэснае імя.

# Матрыцы дастаўлены на самалёце

Глыбокая ноч. На некалькі гадзін замерла, заспакоілася шумлівая Масква. Але не ўсюды. Не спіць Шарамецьеўскі аэрадром, дзе адзін за адным садзяцца і адкуль узлятаюць у неба хуткакрылыя самалёты.

Кожную ноч роўна ў 2 гадзіны 10 мінут з Масквы бярэ курс на Мінск самалёт «ЛІ-2» з матрыцамі свежага нумара «Праўды». Далёка не заўсёды спрыяльнае надвор'е спадарожнічае палёту. Бываюць і снегапады, і дажджы, і моцныя ветры, але ўсёроўна рэйс павінен адбыцца: затрымаць жа друкаванне чарговага нумара газеты зусім немагчыма. І калі на Мінскім аэрадроме прыняць самалёт па метэаралагічных умовах не могуць, скрынку з матрыцамі скідаюць з парашутам.

Самалёт з Масквы прыбывае ў Мінск у 5 гадзін 20 мінут раніцы. Узімку ў такі час сутак глыбокая цемра, і не так проста скінуць матрыцы менавіта там, дзе трэба, каб яны не пашкодзіліся і не згубіліся. Праз 20 мінут скрынка з матрыцамі свежага нумара «Праўды» ужо ў друкарні выдавецтва «Звязда».

Пастаянны прадстаўнік выдавецтва «Праўда» Іван Якаўлевіч Прыліпка ўскрывае скрынку і правярае цэласнасць матрыц. Усё ў парадку, можна іх перадаваць для далейшай апрацоўкі ў цэх. Вопытны мінскі стэрэатыпёр А. К. Кавалеўскі неадкладна пачынае старанную апрацоўку. Праходзіць яшчэ некалькі часу, і паласы паступаюць у вялізны, светлы і высокі друкарскі цэх, ва ўсю даўжыню якога выцягнуўся айчынны друкарскі агрэгат з вялікімі літарамі «ГА», які дае да 50 тысяч чатырохпалосных адбіткаў у гадзіну, а можа даваць і ўсе 70 тысяч. На гэтым жа агрэгаце, акрамя газет рэспубліканскіх, адначасова друкуюцца масавым тыражом «Правда», «Известия», «Комсомольская правда», «Сельская жизнь» і іншыя.

Мінск—дваццаць трэці па ліку горад Савецкага Саюза, дзе друкуецца наш юбіляр — цэнтральны орган партыі, створаны 50 год назад У. І. Леніным.

У 7 гадзін 10 мінут раніцы пачынаецца друкаванне газеты, і неўзабаве ўсе 20 тысяч экземпляраў, якія прызначаны для беларускіх падпісчыкаў, ужо гатовы. Зараз можна прыступаць да экспедыравання, і «Праўду» у дзень яе выхада чытаюць не толькі ў Мінску, але і ў многіх іншых месцах Беларусі.

...І зноў у начным небе ляціць з Масквы самалёт у Мінск. Свежы нумар цэнтральнай «Праўды» будзе ў час дастаўлен у сталіцу Беларусі, хутка аддрукаван і без затрымкі разасланы шматлікім падпісчыкам.

**Я. САДОЎСКІ.**




**Тысячы «баявых лісткоў» выходзіла ў партызанскіх атрадах у Вялікую Айчынную вайну. Усе яны, малодшыя сёстры ленінскай «Праўды», былі надзейнай, баявой зброяй.**

**На здымку: «баявыя лісткі», якія выходзілі ў партызанскім атрадзе імя газеты «Праўда».**

# У барацьбе за перамогу

5 (18) сакавіка 1917 года пасля амаль трохгадовага перапынку выйшаў чарговы нумар «Праўды».

У перадавым артыкуле газета пісала: «У гэтыя вялікія дні адраджаецца рабочая газета. Таварышы рабочыя, таварышы салдаты, таварышы сяляне—усе, хто чытаў «Праўду» і падтрымліваў яе, сустрэнуць яе як старога сябра. І новыя сябры пойдуць ёй насустрач». І сапраўды, працоўныя сустрэлі выхад «Праўды» з вялікай радасцю.

«Праўда» карысталася заслужаным аўтарытэтам сярод рабочых, салдат, працоўных сялян. Уплыў яе быў вялікім. Адзін з віднейшых дзеячоў Кастрычніцкай рэвалюцыі ў Беларусі і на Заходнім фронце А. Ф. Мяснікоў у сваіх успамінах адзначае, што ў красавіку 1917 года, калі У. І. Ленін прыехаў з-за граніцы, у Мінску быў атрыман нумар «Праўды». У ім былі надрукаваны вядомыя Красавіцкія тэзісы. «З яго прыездам я звязваю пачатак афармлення нашай арганізацыі ў Мінску. Ён першы даў ясныя лозунгі бальшавіцкай партыі. Пасля гэтага нам удалося аформіцца самім як вызначанай арганізацыі, хоць і да гэтага мы ўсе лічылі сябе бальшавікамі».

Побач з друкаваннем кіруючых артыкулаў «Праўда» змяшчала карэспандэнцыі і тэлеграмы з месц, у тым ліку з Беларусі і з Заходняга фронта.

Капіталісты ўпаўне ўсведамлялі тое, якую ўзрыўную сілу мае ў сабе «Праўда», памятуючы яе па 1912—1914 гг. Таму яны ўсяляк перашкаджалі яе распаўсюджванню, падвяргалі яе рэпрэсіям.

Салдаты з фронта пісалі ў «Праўду»: «Мы проста салдаты, якія сядзяць у акопах, хочам, каб да нас на фронт даходзілі не толькі буржуазныя газеты «Речь», «День» і іншыя. Яны дастаўляюцца з вялікай спраўнасцю, а нашы рабочыя газеты, якія стаяць на варце нашых інтарэсаў, як «Правда», «Солдатская правда».., да нас не даходзяць. А мы ж выпісваем іменна гэтыя газеты!»

Ліпеньскія падзеі з'явіліся пераломным момантам у развіцці рускай рэвалюцыі. Буржуазія перайшла ў наступленне супраць бальшавіцкіх арганізацый і іх органаў друку.

5 ліпеня да будынку «Праўды» прыбыў грузавы аўтамабіль з юнкерамі, салдатамі і казакамі. Прыехаўшыя абяззброілі ахову рэдакцыі, уварваліся ў памяшканне і пад выглядам вобыску ўчынілі там пагром. Член рэдкалегіі К. С. Ерамееў, супрацоўнікі рэдакцыі і канторы былі арыштаваны і адпраўлены ў штаб акругі. Туды ж юнкеры даставілі захопленыя пры вобыску рукапісы, кнігі. На шчасце, юнкеры не засталі ў рэдакцыі У. І. Леніна, які выйшаў адтуль за паўгадзіны да налёту.

На наступны дзень выйшаў «Листок «Правды». У рэдакцыйным паведамленні гаварылася: «Не маючы магчымасці выпусціць сёння чарговы нумар «Праўды», мы выпускаем «Листок «Правды». Заўтра мы спадзяёмся выпусціць чарговы нумар «Праўды». «Листок «Правды» быў надрукаваны ў партыйнай друкарні «Труд», але на наступны дзень была разгромлена і яна. На Шпалернай вуліцы (зараз вуліца Воінава) ля казармы Усурыйскага палка натоўпам раз'юшаных буржуа і казакаў быў зверскі забіты актыўны карэспандэнт бальшавіцкіх газет рабочы І. А. Воінаў, які распаўсюджваў «Листок «Правды».



Тут, у Пецярбургу, па вуліцы Іванаўскай (цяпер Сацыялістычная), у доме № 14, 5 мая (22 красавіка) 1912 года вышаў першы нумар бальшавіцкай газеты «Правда».

# ПЫТАННІ МАСТАЦТВА Ў „ПРАВДЕ“

Вялікую ролю адыграла газета «Правда» ў стварэнні і развіцці перадавога, прасякнутага ідэямі камунізма, мастацтва. На працягу ўсёй сваёй паўвекавой гісторыі яна з'яўляецца нястомным барацьбітом за перамогу ленінскіх прынцыпаў, палітыкі партыі ў, бадай, самай складанай галіне дзейнасці людзей — мастацкай творчасці.

У першыя гады выхаду ў свет газета прапагандавала лепшыя творы рэалістычнага мастацтва, выступала супраць буржуазных рэакцыйных плыняў, арганізоўвала вакол сябе рэвалюцыйна настроеных мастакоў, выяўляла і падтрымлівала таленты з народу. Ва ўмовах царызма, жорсткага цэнзурнага рэжыму «Правда» літаральна адкрыла шырокаму чытачу дзесяткі імёнаў таленавітых пісьменнікаў і мастакоў—рускіх, украінскіх, грузінскіх, армянскіх, пазнаёміла з перадавымі прадстаўнікамі зарубежнага мастацтва. Яна абараніла М. Горкага ад нападак буржуазных літаратараў, актыўна падтрымала яго ў барацьбе супраць безыдэйнага мастацтва. З яе старонак упершыню загаварылі з народам А. Серафімовіч, Д. Бедны і іншыя пралетарскія пісьменнікі.

Аб вялікай увазе «Правды» да пытанняў літаратуры і мастацтва сведчыць той факт, што толькі за першыя два гады выдання (1912—1914) на яе старонках было надрукавана звыш тысячы вершаў, нарысаў, апавяданняў і рэцэнзій. Публікацыю і ацэнку мастацкіх твораў у бальшавіцкім друку партыя разглядала як адну з важнейшых форм ідэалагічнага выхавання мас.

У. І. Ленін асаблівую ўвагу ўдзяляў правільнай пастаноўцы ў газеце крытыка-бібліяграфічнай работы. Менавіта літаратурна-крытычнымі матэрыяламі, на яго думку, газета можа найбольш актыўна ўздзейнічаць на масы. Вядома, калі гэтыя артыкулы змястоўныя, палітычна завостраныя, выразныя па форме. Крытыкі-праўдзісты давалі ўзоры такіх матэрыялаў.

«Правда» верыла ў будучы росквіт новага мастацтва, вызначала мэты і характар яго—яно павінна служыць народу, масам, несці ў сабе высокія ідэі.

Пасля перамогі Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі ўвага «Правды» да пытанняў мастацтва не аслабла. З першых жа дзён савецкай улады яна павяла актыўную барацьбу за ленінскі лозунг «мастацтва належыць народу», за новае па духу, прасякнутае ідэямі сацыялізма мастацтва. Газета давала рашучы адпор усім тым, хто скажаў палітыку партыі ў галіне мастацтва.

У 20-я гады газета «Правда» вяла актыўную барацьбу супраць антыленінскай практыкі пралеткультаўцаў, якія імкнуліся адгарадзіць мастацтва ад жыцця, ад палітыкі партыі. У гэтым сэнсе выключнае значэнне мела апублікаванне ў снежні 1920 года рэзалюцыі ЦК РКП(б) «Аб пралеткультах».

Шырокае асвятленне на старонках «Правды» знайшлі пастановы ЦК РКП(б) «Аб палітыцы партыі ў галіне мастацкай літаратуры» (1925 г.), «Аб перабудове літаратурна-мастацкіх арганізацый» (1932 г.), дзе былі намечаны канкрэтныя шляхі і ўмовы развіцця літаратуры і іншых відаў савецкага мастацтва.

Для развіцця савецкага мастацтва вялікае значэнне меў I з'езд савецкіх пісьменнікаў. «Правда» шырока асвятляла гэтую падзею. Напярэдадні з'езда ў ёй былі ўведзены спецыяльныя рубрыкі: «Насустрач Усесаюзнаму з'езду пісьменнікаў», «Творчая трыбуна» і іншыя, дзе друкаваліся розныя матэрыялы па важнейшых пытаннях літаратурна-творчага жыцця. 17 жніўня 1934 года, у дзень адкрыцця з'езда, газета надрукавала перадавы артыкул «Свята савецкай культуры», а таксама інфармацыйныя матэрыялы, потым рэгулярна давала «Дзённік з'езда». Газета растлумачвала мэты і задачы маладой творчай арганізацыі—Саюза пісьменнікаў СССР.

Шырока асвятляла «Правда» літаратурна-творчае жыццё краіны ў наступныя гады. На яе старонках чытач знаходзіў крытычныя артыкулы, рэцэнзіі, выступленні дзеячоў літаратуры і мастацтва, водгукі рабочых і сялян, змяшчала «Правда» нарысы, апавяданні, урыўкі з раманаў (напрыклад, «Паднятая цаліна» і «Ціхі Дон» М. Шолахава, «Брускі» Ф. Панфёрава, «На Усходзе» П. Паўленкі і іншыя).

Ні адзін від мастацтва не абыходзіла «Правда». На яе старонках чытач заўсёды знаходзіў глыбокія і прынцыповыя матэрыялы па самых надзённых творчых пытаннях.

Гартаеш пажоўклыя ад часу старонкі за верасень-снежань 1934 года і амаль праз нумар-два знаходзіш заметкі, інфармацыі ці артыкулы аб літаратуры, тэатры, музыцы, кіно, правапісу, самадзейным мастацтве, сустракаеш рубрыку «Конкурс на лепшую п'есу», «Па майстэрнях савецкіх мастакоў».

Студзень 1935 года. Савецкая кінематаграфія адзначае сваё 15-годдзе. 11 студзеня «Правда» змяшчае прывітанне ЦК ВКП(б) работнікам кіно і рэдакцыйны артыкул, у якім вызначае важнейшыя задачы савецкага кінамастацтва, падкрэслівае яго ролю ў камуністычным выхаванні мас.

У 1936 годзе газета друкуе шэраг артыкулаў аб оперных і балетных спектаклях, выступае супраць праяўленняў фармалізма ў савецкім музычным мастацтве, ў жывапісу і архітэктуры.

Выступленні многіх пісьменнікаў, рэжысёраў, артыстаў, крытыкаў сустракаеш на старонках «Правды» ў перадваенныя гады. Газета выхавала цэлую плеяду партыйных крытыкаў і публіцыстаў.

І ў цяжкія гады вайны цэнтральны орган нашай партыі знаходзіў магчымасці асвятляць творчае жыццё краіны. Часцей за ўсё змяшчала газета нарысы і апавяданні, публіцыстычныя выступленні буйнейшых савецкіх пісьменнікаў. З яе старонак гучэў патрыятычны голас А. Талстога, М. Шолахава, Ус. Вішнеўскага, А. Фадзеева, Л. Леонава, Л. Собалева, А. Твардоўскага, К. Сіманава, І. Эрэнбурга і другіх пісьменнікаў і паэтаў, дзеячоў іншых відаў мастацтва.

З публіцыстычнымі артыкуламі і вершамі аб патрыятычнай барацьбе народа не раз выступалі ў «Правде» беларускія пісьменнікі і паэты Я. Купала, Я. Колас, М. Лынькоў, П. Броўка, А. Куляшоў, М. Танк. Яны заклікалі народ на подзвігі ў імя Радзімы, усялялі веру ў перамогу над ворагам.

У пасляваенны час увага «Правды» да пытанняў літаратуры і мастацтва яшчэ больш узрасла. Розныя формы і жанры прымяняе газета для асвятлення іх —ад заметак і інфармацый аб навінах мастацтва да глыбокіх тэарэтычных артыкулаў, ад кароткіх вершаў, замалёвак да нарысаў і паэм, урыўкаў з аповесцей, раманаў, п'ес, кінасцэнарыяў. Усе важнейшыя з'явы мастацтва знаходзяць на яе старонках прынцыповую партыйную ацэнку. Партыя праз свой цэнтральны орган перасцерагае дзеячоў мастацтва ад памылак, кліча да новых поспехаў.

Супраць безыдэйнага, адарванага ад жыцця мастацтва былі накіраваны перадавыя і рэдакцыйныя артыкулы, надрукаваныя ў першыя пасляваенныя гады. На старонках «Правды» былі ўскрыты сур'ёзныя недахопы ў развіцці савецкай музыкі, драматургіі, архітэктуры, крытыкі. Рэзка асудзіла газета тэорыю і практыку бесканфліктнасці ў мастацтве.

Вялікі ўплыў на ўсё творчае жыццё аказалі змешчаныя ў «Правде» (май 1958 года) пастанова ЦК КПСС аб выпраўленні памылак у ацэнцы опер і рэдакцыйны артыкул з гэтага поваду. «Правда» шырока папулярызуе ўказанні М. С. Хрушчова аб цеснай сувязі савецкага мастацтва з жыццём народа.

Задачу выключнай важнасці паставіў перад савецкім мастацтвам XXII з'езд КПСС. Быць на ўзроўні патрабаванняў партыі і народа, натхняць сваімі творамі будаўнікоў камунізма—галоўнае, што патрабуецца зараз ад дзеячоў мастацтва. Менавіта да гэтага заклікае «Правда». Заклікае настойліва, нястомна.

Е. Л. БОНДАРАВА,
выкладчык кафедры тэорыі і практыкі партыйна-савецкага друку.

## Сустрэча з праўдзістам

*Чым менш часу заставалася да слаўнай гадавіны — 50-годдзя з дня выхаду «Правды», тым большую цікавасць праяўлялі першакурснікі-журналісты да старэйшай бальшавіцкай газеты. Яны праглядвалі падшыўкі за мінулыя гады, уважліва сачылі за кожным свежым нумарам «Правды», абмяркоўвалі найбольш цікавыя карэспандэнцыі.*

*З вялікай радасцю сустрэліся студэнты з карэспандэнтам «Правды» Іванам Рыгоравічам Новікавым, былым выпускніком нашага універсітэта. Ён расказаў аб сваёй карэспандэнцкай рабоце, аб тых пытаннях і задачах, з якімі штодзённа прыходзіцца сутыкацца карэспандэнту.*

*Нялёгкая праца карэспандэнта. Кожны дзень яму прыходзіцца шукаць штосьці новае ў жыцці, новыя тэмы, новыя формы падачы матэрыялу. Але якая ж гэта цікавая і патрэбная людзям прафесія! Да каго ж, як не да карэспандэнта, ідзе чалавек са сваёй скаргай, з парадай або каб расказаць аб якім-небудзь вынаходніцтве, падзяліцца сваімі дасягненнямі, вопытам?*

*Вось у кабінет карэспандэнта ўвайшоў пажылы чалавек. У руках яго пажоўклы ад даўнасці вучнёўскі сшытак.*

*— Запіскі Веры Харужай,—паведаміў наведвальнік.—Знайшоў у архіве. Можа спатрэбяцца...*

*Карэспандэнт расшыфраваў запіскі, апрацаваў іх. Гутарыў з многімі людзьмі, якія сустракаліся або што-небудзь ведалі аб Веры Харужай. У выніку ў «Правде» з'явілася карэспандэнцыя. Затым выйшла ў свет асобная кніжка. Людзі даведаліся аб многіх добрых справах, аб гераічных подзвігах беларускай патрыёткі.*

*Многа цікавага расказаў яшчэ Іван Рыгоравіч Новікаў, даў шэраг карысных парад, як лепш і глыбей авалодаць прафесіяй журналіста.*

М. ЯКІМЧЫК.

# Кастрычніцкай рэвалюцыі

ЦК партыі прыняў меры да хутчэйшага аднаўлення выдання цэнтральнага органа. 23 ліпеня вышаў першы нумар газеты «Рабочий и солдат». Уся партыя і рабочы клас з вялікім задавальненнем сустрэлі адраджэнне цэнтральнага органа.

У ноч на 10 жніўня ў друкарню «Рабочий и солдат» прыбыў атрад міліцыі. Набор чарговага нумара быў рассыпан, а ад упраўляючага ўзялі распіску аб тым, што газета не будзе больш друкавацца. Тры дні партыя была без газеты. 13 жніўня цэнтральны орган пачаў выходзіць пад назвай «Пролетарий».

23 жніўня ў «Пролетарии» на відным месцы тоўстым шрыфтам быў змешчан зварот ЦК партыі да рабочых і салдат — не паддавацца на правакацыю, захоўваць вытрымку і пільнасць, не прадпрымаць ніякіх вулічных выступленняў. У той жа дзень увечары Керэнскі загадаў камандуючаму войскамі Петраградскай ваеннай акругі неадкладна закрыць «Пролетарий».

Выпучшаны замест яго «Рабочий» апублікаваў заклік ЦК партыі і другіх рэвалюцыйных органаў да рабочых і салдат Петраграда зламаць і сцерці з зямлі буржуазную контррэвалюцыю «Вы здолелі звергнуць царызм,— гаварылася ў звароце,— дакажыце, што вы не пацерпіце панавання стаўленіка памешчыкаў і буржуазіі Карнілава».

2 верасня па распараджэнню петраградскага генерал-губернатара «Рабочий» быў закрыт. Але разграміць друкарню Часоваму ураду на гэты раз не удалося. Узброены атрад матросаў узяў яе пад сваю ахову. Гэта дазволіла ЦК партыі неадкладна арганізаваць выданне цэнтральнага органа пад новай назвай. 3 верасня стаў выходзіць «Рабочий путь».

У «Рабочем пути» штодзённа друкаваліся заклікі да рабочых, салдат і сялян рыхтавацца да Усерасійскага з'езда Саветаў. 25 кастрычніка цэнтральны орган партыі «Рабочий путь» выйшаў з надрукаваным на ўсю першую старонку лозунгам «Уся ўлада Саветам рабочых і сялян! Міра! Хлеба! Зямлі!».

«Рабочий путь» паведаміў аб перамозе ўзброенага паўстання ў сталіцы, аб адкрыцці ў Смольным 25 кастрычніка II Усерасійскага з'езда Саветаў. У падрабязнай справаздачы аб экстрэным пасяджэнні Петраградскага Савета гаварылася аб першым пасля ліпеньскіх падзей публічным выступленні У. І. Леніна, які быў сустрэт прысутнымі бурнымі апладысментамі.

27 кастрычніка цэнтральны орган партыі выйшаў пад назвай «Правда». У артыкуле «Пад старой назвай» гаварылася: «З сённяшняга дня газета пачынае выходзіць пад сваім старым імем «Правда». У дні ліпеньскага паражэння дыктатары буржуазнай контррэвалюцыі спадзяваліся забіць «Правду». Адзін за адным былі закрыты затым прыйшоўшыя на змену «Правде» друкаваныя органы нашай партыі «Рабочий и солдат», «Пролетарий» і «Рабочий». Два дні таму назад урад Керэнскага рашыў сцерці з зямлі «Рабочий путь». Але цяпер з зямлі зцёрта ўлада Керэнскага, пралетарска-сялянская рэвалюцыя святкуе. Буржуазна-памешчыцкая контррэвалюцыя адступае ў беспарадку.

Ад гэтага часу мы будзем працягваць барацьбу пад старым сцягам «Правды», у якой працоўныя масы даўно прывыклі бачыць выражэнне сваёй рэвалюцыйнай думкі і волі».

М. ЗЯРНІЦКІ,
кандыдат гістарычных навук, дацэнт.



**На здымку:** дом № 32 па набераржнай ракі Мойкі ў Петраградзе, дзе з 5 сакавіка па 5 ліпеня 1917 года размяшчалася рэдакцыя газеты «Правда».



*Насценная газета фізічнага факультэта карыстаецца заслужаным аўтарытэтам сярод студэнтаў. Яна цікава і з густам афармляецца, багата ілюструецца. Напярэдадні святкавання 50-годдзя газеты «Правда» выйшаў чарговы нумар яе.*

# З універсітэцкай хронікі 50-х гадоў

*Памятнай падзеяй восені 1951 года была сустрэча студэнтаў нашага універсітэта з праўдзістамі. Вестка аб выступленні ва універсітэце журналістаў-праўдзістаў, нягледзячы на тое, што аб'ява аб гэтым была вывешана ўсяго за некалькі гадзін да іх прыбыцця, хутка разыйшлася па універсітэце, і самая большая аўдыторыя аказалася перапоўненай студэнтамі і выкладчыкамі.*

*Тав. П. Сацюкаў (тады—намеснік галоўнага рэдактара «Правды») асвяціў становішча і перспектывы журналісцкай адукацыі ў нашай краіне.*

*Старэйшы савецкі журналіст Д. Заслаўскі расказаў шмат цікавага аб вопыце сваёй работы над фельетонамі.*

*— Фельетон,—сказаў ён,—гэта твор публіцыстычны, таму мы патрабуем ад яго партыйнай накіраванасці. Як адбіраць матэрыял для фельетона? Няма фактаў фельетонных і нефельетонных, ёсць фельетоннае афармленне фактаў. Скрозь і ўсюды звычайна шэры факт, нічым як быццам бы не знамянальны, загараецца яркім святлом, калі востры сатырычны погляд адкрывае ў ім цікавыя бакі, якія гавораць аб важнай з'яве.*

*У заключэнне П. Сацюкаў і Д. Заслаўскі адказалі на шматлікія пытанні студэнтаў і выкладчыкаў універсітэта.*

*Сустрэча з праўдзістамі пакінула глыбокае, незабыўнае ўражанне.*

# Свая газетная „кухня"

*Кожнаму з нас прыемна ўбачыць надрукаваную ў газеце сваю заметку. Хай яна будзе зусім невялікай па аб'ему, але якой значнай і важнай здаецца яна.*

*Патрабавальны рэдактар прабег яе вачыма і вымавіў: «Пойдзе!» І ўсё. На гэтым праца аўтара закончана. А як жа робіцца газета, які далейшы шлях артыкула?*

*Да нядаўняга часу многія студэнты-журналісты вельмі смутна ўяўлялі сабе гэта. Адна справа праслухаць лекцыю, а другая — паглядзець на ўвесь працэс сваімі вачыма, зрабіць газету ўласнымі рукамі. І такая магчымасць з'явілася ў нас зусім нядаўна, з выхадам вучэбнай газеты «Журналіст».*

*Што гэта нам дае? У нас ёсць цяпер магчымасць бываць на прадпрыемствах, у калгасах і саўгасах, бліжэй знаёміцца з асноўным вытворчым працэсам, унікаюць у аснову сельскай гаспадаркі, сустракацца з людзьмі. Жывыя творчыя гутаркі, абмеркаванне нумароў далі магчымасць больш патрабавальна адносіцца да напісанага самім і сваім таварышам. З чыста газетнага пункту гледжання вучэбная газета «Журналіст» аказала нам вялікую паслугу. Пачынаючы з арганізацыі матэрыялаў, рэдактарскай праўкі, друкавання на машынцы сваіх матэрыялаў, макеціравання, вёрсткі і выпуску газеты—усё гэта робіцца самімі студэнтамі. Тое, што ўсвоена тэарэтычна, замацоўваецца на практыцы. Кожны з нас добра ведае цяпер, як разлічыць месца на газетнай паласе, як робіцца клішэ, вывучыў правілы вёрсткі, атрымаў магчымасць праверыць свае веды на справе.*

*Л. АСМОЛАЎ.*

# Гэта наш, філфакаўскі...

*Не пра кожнага з гонарам скажаш гэтыя словы. А пра яго нельга не сказаць. Такія чароўныя песні! Словы і музыку напісаў ён сам, Яўген Казюкін. Сам жа акампануе на гітары. «Талент!»—захапляюцца на канцэрце гледачы. А для нас, аднакурснікаў, ён проста Жэнька, жывы і чуллівы таварыш, надзейны сябра, выдатны памочнік, сціплы і сумленны, працавіты і актыўны. Усё гэта так уласціва яму і так удала спалучаецца ў ім, што здзіўляешся, як у яго хапае часу і ўмення.*

*Яўген Казюкін—студэнт 1 курса аддзялення журналістыкі. Засталіся ззаду гады вайсковай службы, з'явіліся новыя сябры, новыя справы. Іх многа, яны патрабуюць актыўных адносін да жыцця. Новае выпрабаванне—першая ў жыцці экзаменацыйная сесія. Яна здана на «добра» і «выдатна». Але Яўген не задаволены: патрэбна толькі на «выдатна»! Наступная сесія патрабуе ад яго больш намаганняў, працавітасці. А часу так не хапае...*

*Сёння вечарам зноў рэпетыцыя аркестра народных інструментаў. Ды хутка і чарговы канцэрт— патрэбна ж дапамагчы хлопцам арганізаваць яго, каб усё прайшло зладжана і цікава. Трэба яшчэ падумаць і над абнаўленнем свайго рэпертуара. Напісаны ўжо дзве песні: «Студэнцкая» і «Салдацкая лірычная». Яны ўжо пайшлі ў жыццё, усім падабаюцца, усе спяваюць іх з ахвотаю і ганарацца, што створаны яны на нашым факультэце.*

*На жаль, ёсць у нас на факультэце недахопы, а выкараняць іх з нашага жыцця абавязкова патрэбна. На студэнцкія тэмы едкія, злабадзённыя частушкі напісаў аднакурснік Яўгена Пётр Сушко. Па вечарах у ленінскім пакоі інтэрната па вуліцы Свярдлова чуваць ужо гукі гітары Яўгена Казюкіна і голас салісткі Марыі Пашукевіч. Гэта толькі яшчэ рэпетыцыі. На наступным канцэрце шмат каму прыдзецца пачырванець за свае недарэчныя паводзіны.*

*Яўген Казюкін не толькі актыўны ўдзельнік мастацкай самадзейнасці на факультэце. Для камсамольскага актыва ён нібы «выратавальны круг». Ніколі не адкажацца дапамагчы ў справе. Патрэбна паехаць з канцэртам у вайсковую часць, у падшэфную школу або на прадпрыемства—ён заўсёды дапаможа арганізаваць паездку, з'явіцца актыўным яе ўдзельнікам.*



*Шмат спраў у непаседы. І мне ад усёй душы хочацца сказаць яму: «Поспехаў табе, Жэня, вялікіх здзяйсненняў!»*

М. ЗНАК.

# Па ленінскіх месцах

*Свае студэнцкія гады я правеў у старажытным Кракаве, горадзе, якому выпаў вялікі гонар: тут жыў і працаваў Уладзімір Ільіч Ленін. Польскія паны рабілі ўсё, каб аддаць забыццю месцы, такія дарагія і блізкія сэрцу працоўных. На дамах, дзе жыў Ільіч, не было памятных дошак, у афіцыйных даведніках і даведніках для турыстаў аб гэтых месцах нічога не пісалася. Змова маўчання вакол ленінскіх мясцін у Кракаве ўладам не ўдалася. Любоў народа была мацней за гранітныя помнікі. Вуліцы Звежанец і Любамірскую, а таксама дамы, у якіх пражываў Ленін, ведалі ўсе. Я часта бачыў, асабліва ў ленінскія дні, рабочых і студэнтаў, якія невялікімі групкамі і па-аднаму прагульваліся павольна па гэтых ціхіх, непрыкметных вуліцах. Многія, як і я, відавочна, думалі ў такія хвіліны, што вось па гэтых тратуарах хадзіў Ільіч, абдумваючы планы, якія пасля дапамаглі перасўтварыць свет.*

*Ведаў я старога рабочага-маляра, які быў знаёмы з Леніным. Ён паказаў мне месцы, дзе Ленін часта гуляў. Гэта былі «планты» (так у Кракаве называюць зялёнае кольца на месцы старой крэпасной сцяны) паміж Ягелонскай бібліятэкай і Вавелем.*

*Цяпер ленінскія месцы ў Кракаве акружаны клопатамі, яны заўсёды будуць напамінаць будучым пакаленням: тут жыў і працаваў тытан думкі, вялікі трыбун рэвалюцыі Уладзімір Ільіч Ленін.*

**В. МЕЛЬЦАР,**
нам. сакратара партбюро гістфака.

# Девушка из нашего села

**Слова и музыка студента 1 курса отделения журналистики Евгения КАЗЮКИНА.**



**Загрустит солдат порой,**
**случается,**
**На привале ночью у костра.**
**Где же ты сейчас, моя красавица,**
**Девушка из нашего села?**

**Снятся часто очи твои синие,**
**Слышу голос милый и родной.**
**Как отчизну, берегу, любимая,**
**Днём и ночью я твою любовь.**

**С нею мне легки походы дальние,**
**И мороз, и слякоть — нипочем.**
**Словно ты со мною, рядом,**
**славная,**
**Рядом твоё чувствую плечо.**

**Спят бойцы — ведь летом ночь**
**короткая.**
**Только мне сегодня не до сна.**
**Где же ты сейчас, моя хорошая,**
**Девушка из нашего села?**

# ЛЕТАПІС СУЧАСНАСЦІ

## Нарысы «Героі нашых дзён» на старонках «Праўды».

Кожная эпоха нараджае сваіх герояў. Успомнім слаўныя імёны мінулага: Пугачова і Разіна, Кутузава і Суворава, Папова і Цыялкоўскага. Успомнім выдатную плеяду рускіх рэвалюцыянераў-дэмакратаў. Іх жыццё, адданае беззапаветнаму служэнню народу, можна назваць подзвігам.

Асабліва масавым гераізм становіцца ў наш, савецкі час, калі свабодны чалавек, які горача любіць сваю Радзіму і свой народ, ідзе на подзвіг свядома, па загаду сэрца і розуму. Ён ведае, што яго зразумеюць, падтрымаюць і пойдуць за ім мільёны такіх жа адданых і гатовых на любы подзвіг людзей.

Чалавек савецкай эпохі, выхаваны Камуністычнай партыяй, самаадданa працуе на зямлі і пад зямлёй, у небе і на моры. Ён стойкі барацьбіт, актыўны будаўнік новага свету і носьбіт перадавых ідэалаў стагоддзя. Ужо цяпер выразна выступаюць рысы новага чалавека—чалавека камуністычнай будучыні.

Каго з сучаснікаў мы называем героямі нашага часу? Тых, хто пакарае магутныя рэкі, прыручае неўтаймаваную энергію атама, хто смела штурмуе космас і натхнёна працуе ў камуністычных брыгадах.

Уславіць героіку нашых дзён, стварыць праўдзівыя вобразы сучаснікаў, будаўнікоў камунізма— вось у чым задача і ганаровы абавязак работнікаў друку, літаратуры, мастацтва.

31 кастрычніка 1960 года рэдакцыя газеты «Правда» звярнулася да журналістаў і пісьменнікаў, рабкораў і селькораў з заклікам—ствараць на старонках газеты партрэты герояў сямігодкі, пісаць аб тых, хто ідзе наперадзе і захапляе сваім прыкладам таварышаў, хто сам, гаручы на рабоце, запальвае іншых.

Гэты заклік быў пачут і горача падтрыман ва ўсіх кутках нашай неабсяжнай Радзімы. Першымі на зварот газеты адгукнуліся журналісты і пісьменнікі Масквы. Яны заявілі: «Гэта наша кроўная справа і ганаровы абавязак».

У рэдакцыю «Праўды» ішлі патокам пісьмы, у якіх расказвалася аб добрых людзях краіны. З першых нарысаў, апублікаваных пад рубрыкай «Героі нашых дзён», чытачы «Праўды» ўведалі імёны таленавітага канструктара крылатых караблёў Расціслава Аляксеева, знатнай тэкстыльшчыцы Юліі Вечаровай, кузнецкага сталявара Міхаіла Прывалава, узбекскай камбайнёркі Турсуной Ахунавай.

4 студзеня 1961 года «Правда» надрукавала нарыс М. Манахавай «Шчодрае сэрца». Гэта выдатны расказ пра праслаўленага расточніка Мінскага завода аўтаматычных ліній Аляксандра Віташкевіча. Пачынальнік многіх вялікіх спраў, выдатны майстар-выхавацель «Аляксандр адносіцца да тых, хто глядзіць на чалавека прама, сэрца яго, душа камуніста адкрыта людзям». Такі наш сучаснік, наш зямляк Аляксандр Віташкевіч, Герой Сацыялістычнай Працы, дэпутат Вярхоўнага Савета СССР, член ЦК КПБ.

«Правда» адкрыла нам героя космаса Юрыя Гагарына. Яго бяспрыкладнаму подзвігу газета прысвяціла нарысы, рэпартажы, артыкулы, цэлыя старонкі.

За кароткі час пяром журналістаў, пісьменнікаў, рабочых і сялянскіх карэспандэнтаў была створана серыя нарысаў аб нашых «маяках», аб тых, хто апярэджвае час. Здзіўляючая галерэя партрэтаў нашых сучаснікаў саставіла вялікую кнігу «Героі нашых дзён», выдадзеную выдавецтвам «Правда» напярэдадні XXII з'езда Камуністычнай партыі Савецкага Саюза.

Такія кнігі будуць выдавацца і далей, бо кожны дзень нашага жыцця нараджае новыя імёны, новых герояў. І аб іх павінен ведаць увесь свет.

**Я. ПРАКОП'ЕЎ,**
студэнт 5 курса аддз. журналістыкі.



*На здымку: студэнты 2 курса аддзялення журналістыкі за вёрсткай чарговага нумара вучэбнай газеты «Журналіст», прысвечанай жыццю саўгаса «Гайна» Лагойскага раёна.*

Фота Э. ДАМАРАЦКАГА.

**Мінск**, Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, 212, тэл. 2-07-19. *Друкарня выдавецтва МВСС і ПА БССР.* Зак. 1153. АТ 12931. **Нам. рэдактара А. ВОЛК.**